14.00 Новости (с сурдопереводом).
14.20 Сериал "Возвращение на Остров сокровищ". 8-я серия.
15.10 "Окно в Европу". Ведущий- Д.Киселев.
15.40 В мире животных.
16.15 Леонид Якубович в телеигре "Колесо истории".
17.00 Новости.
17.20 Ералаш.
17.45 "Золотая серия". Борис Чирков и Василий Меркурьев в фильме "Верные друзья".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.45 Программа передач.
20.50 Николь Кидман в сериале "Вьетнам. До востребования". 10-я серия, заключительная.
21.45 "Каламбур". Юмористический журнал.
22.15 "Коллекция Первого канала". Жанна Моро в фильме Франсуа Трюффо "Жюль и Джим".
0.10 Программа передач.

Канал "Россия"
7.00 Лукоморье.
7.35 Мультфильм.
8.05 "Мак и Матли". Сериал.
8.30 По вашим письмам.
9.00 Экспортлес.
9.15 Парламентская неделя.
10.00 Вести в одиннадцать.
10.15 Книжная лавка.
10.30 Доброе утро.
11.00 21-й кабинет.
11.25 Анонимные собеседники.
11.55 "Поэт в России — больше, чем поэт..."
12.25 Проще простого.
13.00, 19.00, 23.55 Вести.
13.20 "Тайна Сахары". Премьера худ.фильма (Италия). 5-я серия.
14.15 Ничего, кроме...
14.30 Де факто.
14.55 Сад культуры.
15.25 Своя игра.
15.50 Песня России.
16.45 Старая квартира.
18.00 "Королева Марго". Худ. фильм. 14-я серия.
19.35 Субботний вечер с Зиновием Гердтом.
21.05 Погода на завтра.
21.10 Двойной портрет.
22.05 "Гарри Трейси". Худ. фильм (США).
0.10 Программа "А".

Санкт-Петербург
9.25 По реке плывет топор.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Информ ТВ.
10.10 "Честь имею". Военное обозрение.
10.40 "Столько чувства в напеве родном". Фильм-концерт.
11.10 Ток-шоу "Наобум".
11.40 Страсти-мордасти.
12.10 "Человек-невидимка". Телеспектакль.
14.10 Еще одна Россия.
14.25 Усадьбы.
14.50 Мультфильм.
15.10 Спортивное обозрение.
15.25 Парадоксы истории. "6 ноября 1796г. До и после полуночи".
16.10 Экспресс-кино.
16.35 Детское ТВ: студия "Вообрази".
17.00 Зебра.
17.35 Показывает Ленинградская областная телекомпания. Телеигра "Лотто-бинго".
18.40 Большой фестиваль.
19.20 "Риск без контракта". Худ. фильм (Россия).
20.40 "Браво, маэстро!"
20.55 Светская хроника.
21.10 Блеф-клуб.
21.45 Роман с героем.
22.15 "Крах инженера Гарина". Худ.фильм. 4-я серия.

НТВ
7.00 Худ.фильм "Чудесные годы" (США).
7.50 Детективы Д.Х.Чейза. "Смерть по контракту" (Италия). 1-я серия.
8.40 Русский альбом. Группа "Колибри".
9.00, 13.00 Сегодня.
9.15 Худ. фильм "Альфредо, Альфредо" (США — Италия).
10.55 Лучшие цирки мира. "10-й магический Гран-при, Монте Карло". Часть 1-я.
11.25 Худ. фильм "В бегах" (США).
13.15 Фестиваль мини-сериалов. "Тайные преступления" (Италия). 1-я серия.
Российские университеты
15.25 Романса трепетные звуки.
15.45 Шаг из круга.
16.05 Информационное обозрение.
16.25 Ток-шоу "Карьера".
НТВ
17.00 Худ. фильм "Дети против монстров" (США). 2-я серия.
17.30 Дог-шоу "Я и моя собака".
18.00, 21.00 Сегодня.
18.30 "Криминальная Россия: современные хроники". Док. сериал.
Фильм 3-й "Маленькая война за икру".
19.00 Мини-сериал "Тайные преступления" (Италия). 2-я серия.
20.00 Намедни.
20.45 Куклы.
21.35 Федерико Феллини. Худ. фильм "Сатирикон Феллини" (Италия-Франция).
23.50 Третий глаз.
0.35 Ночной канал."Плейбой".

Воскресенье, 27 октября
Белорусское телевидение
8.00 Колесо времени. К 400-летию образования Брестской унии.
8.30 "Конон". Мультсериал.
8.55 Победитель. Спортивная программа.
9.15 Студия "Колыбельная". Мультиклуб.
9.45 Вершина мира. Подведение итогов игр октября.
10.20 "Все нормально, мама!" Развлекательная программа.
10.50 Туробъектив.
11.20 Марсово поле. Музыкальная программа для армейцев.
11.50 Международный курьер.
12.20 Мир природы и увлечений.
12.40 Премьер-кино. Ноябрь.
13.25 Студия "Окно". "Накануне будущего", "Телек-шоу".
14.20 "Война в воздухе". Док. сериал (США).
14.45 Вас вызывает Спортландия. Международная товарищеская встреча школьников Беларуси и Узбекистана.
15.45 Мост.
16.10 Театр в кресле.
16.50 "Золотые ключи". Телефестиваль народного творчества.
17.30 По вашим просьбам. М.Неелова и Ю.Будрайтис в худ. фильме "Карусель".
18.40 Компьютерный полигон.
19.05 Бездельник.
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
20.50 Спортивный телекурьер.
21.10 Новости-ТВ.
21.25 Ток-шоу "Карамболь" с участием лидера рок-группы "ДДТ" Юрия Шевчука.
22.00 "Синема" представляет: Изабелла Росселлини в худ. фильме "Галантные дамы".
24.00 Бархатный сезон.

ОРТ.
7.00 Фильм-сказка "Третий принц".
8.25 Мультфильмы нашего детства."Волшебный магазин".
9.00 Новости.
9.15 "Непутевые заметки" Дм.Крылова.
9.30 Пока все дома.
10.10 Утренняя звезда.
11.00 "Служу России!" "Армейский магазин".
11.30 Играй, гармонь любимая!
12.00 Русскiй миръ.
12.30 Сериал "Подводная одиссея команды Кусто". "Киты пустыни".
13.25 Смехопанорама. Ведущий — Е.Петросян.
14.00 Новости (с сурдопереводом).
14.20 Звезды оперы. Тереса Берганца и Хайме Аррагаль (Испания).
15.10 Клуб путешественников.
15.55 Как-то раз.
16.05 Мультфейерверк: "Компьютерные войны", "Приключения Вуди и его друзей".
16.45 "Один на один".
17.20 Счастливый случай.
18.10 Песня-96.
19.00 Время.
19.35 Программа передач.
19.40 КВН-96.
21.50 Футбольное обозрение.
22.20 Новости.
22.30 Роберт де Ниро в остросюжетном фильме "Обратная тяга".
1.00 Программа передач.

Канал "Россия"
7.00 Лукоморье.
7.30 Мультфильм.
7.50 Спортлото.
8.00 "Мак и Матли". Сериал.
8.20 "За околицей". Фольклорный фестиваль.
8.35 Пилигрим.
9.00 Устами младенца.
9.30 Присяга.
10.00 Вести в одиннадцать.
10.15 Русское лото.
10.55 Приз группы "Савва".
11.00 Человек на земле.
11.30 Книжная лавка.
12.00 Телетеатр. А.П.Чехов. "Шампанское", "Разговор пьяного с трезвым чертом".
12.25 Проще простого.
13.00, 23.25 Вести.
13.20 "Тайна Сахары". Премьера худ.фильма (Италия). 6-я серия.
14.15 Ничего, кроме...
14.30 Диалоги о животных.
14.55 Караоке по-русски.
15.25 Экипаж кругосветного плавания.
15.55 Репортер.
16.10 Футбол без границ.
16.40 "У всех на устах". Программа Натальи Дарьяловой.
17.00 Волшебный мир Диснея. "Чокнутый", "Аладдин".
18.00 "Королева Марго". Худ.фильм.
19.00 Зеркало.
19.55 Погода на завтра.
20.00 Репортаж ни о чем.
20.15 "Спортлото-82". Худ.фильм.
21.55 "К-2" представляет: "Колизей".
22.50 У Ксюши.
23.40 Прогулка с Иоганном Штраусом.

Санкт-Петербург
9.25 Папа, мама и я — спортивная семья.
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Информ ТВ.
10.10 Овертайм.
10.40 "Необузданная Африка". Док. сериал. 1-я серия.
11.10 Храм.
11.40 Весь этот цирк.
12.10 "Музыкальная история". Худ.фильм.
13.30 "Военная музыка". Фильм-концерт.
14.10 Еще одна Россия.
15.10 Солисты Мариинки. Александр Морозов.
16.10 Спортивная программа.
16.35 Детское ТВ: "Полосатая музыка", "Сказка за сказкой".
17.35 Показывает Ленинградская областная телекомпания.
18.40 Сокровища Петербурга. Русский музей.
19.20 "Посвящение". Один день Морской академии.
19.35 "Треугольник". Худ. фильм (Армения).
20.55 У всех на виду.
21.10 Ноу смокинг.
21.55 Международное обозрение.
22.20 "Посмотрим". Анонс передач.
22.35 "Идеальная пара". Худ.фильм (Россия — Украина).

НТВ
7.00 Худ.фильм "Чудесные годы" (США).
7.50 Детективы Д.Х.Чейза. "Смерть по контракту". 2-я серия.
8.40 Латиномания.
9.00, 13.00 Сегодня.
9.15 Худ. фильм "Плач невинного" (Ирландия — США).
10.50 Лучшие цирки мира. "10-й магический Гран-при, Монте Карло". Часть 2-я.
11.20 Худ. фильм "Девственность" (Италия — Великобритания).
12.45 Русский альбом. Группа "Настя".
13.15 Мини-сериал "Тайные преступления". 2-я серия.
14.00 Намедни.
14.40 Куклы.

Российские университеты
15.25 Подъем переворотом.
15.55 "Бессмертный воин". Передача 3-я.
16.25 Забытые имена. Сергей Дягилев. Часть 2-я.

НТВ
17.00 Худ. фильм "Дети против монстров" (США). 3-я серия.
17.30 Телеигра "Сто к одному".
18.00 Сегодня.
18.30 Программа В.Познера "Человек в маске".
19.10 "Исчезнувшие цивилизации". Фильм 8-й "Африка" (США).
20.00 Итоги.
21.10 Роберт де Ниро в худ. фильме "Король комедии" (США).

Слова да слухачоў

Ідзе другі месяц нашага вымушанага маўчання — з 1 верасня спынены эфір "FM Радыё 101,2". Ужо другі месяц вы, нашыя шаноўныя слухачы, нашыя прыхільнікі, пазбаўленыя магчымасці чуць аператыўную інфармацыю, актуальныя праграмы, сваю ўлюбёную музыку ў стылі "Радыё 101,2". Пацверджаннем таго, што мы сапраўды былі вам патрэбныя, сталі тысячы тэлефанаванняў, лістоў, зваротаў, у якіх вы выказвалі сваю падтрымку. Салідарнасць з намі праявілі калегі-журналісты з самых розных куткоў свету. У Аўстраліі і Нямеччыне, у Амерыцы і на Балканах, у Скандынавіі і ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы людзі абураюцца ўціскам сродкаў масавай інфармацыі і грубым парушэннем правоў чалавека ў Беларусі.

Мы з самага пачатку разумелі, што прычынаю нашага закрыцця сталі не "технические помехи", а імкненне ўладатрымцаў напярэдадні рэферэндуму задушыць незалежную беларускамоўную радыёстанцыю. Аднак цеплілася надзея на вяртанне ў эфір. Высокія афіцыйныя асобы з Адміністрацыі Прэзідэнта і Міністэрства сувязі і інфарматыкі РБ запэўнівалі нас, што актыўна праводзяцца работы па пераносе перадатчыка, заказана і вырабляецца новая антэна, і ў хуткім часе "Радыё 101,2" зноў пачне працаваць.

Аднак 20 верасня, выступаючы на Маладзёжным форуме, Прэзідэнт А.Лукашэнка абвінаваціў нашую радыёстанцыю ў вядзенні "антыдзяржаўнай палітыкі". Выходзіць, што сёння падача аб'ектыўнай інфармацыі — гэта антыдзяржаўная палітыка, нешаблоннае беларускамоўнае афармленне эфіру — антыдзяржаўная палітыка, музыка беларускіх гуртоў — антыдзяржаўная палітыка. Безупынныя атакі на ўсякую альтэрнатыўную думку, абмежаванне свабоды асобы сталі нормаю ў Беларусі. Улада спрабуе ўстанавіць татальны кантроль над жыццём.

Што застаецца ўсім нам? Зразумець, што ад кожнага залежыць лёс нашай краіны і асабістая свабода. Таму наш выбар — разумнае дзеянне.

Калектыў "Радыё 101,2"

Мікола Трафімчук

***

Народ, перш чым страчвае мову —
сумленне губляе сваё.
А потым...
А потым умомант
злятае на баль варанне.

Над мёртвай смярдзючай святыняй
шчэ доўга кружыцца яму...
Зямля Курапат і Хатыняў,
каму аддаешся, каму?

"Старэйшаму" блуднаму брату,
які распладзіў варанне?
Басяк, перш чым страчвае хату —
сумленне губляе сваё.

***

Прыйсці і пакахаць,
і запавет пакінуць —
такое крэда ў нас
і місія, і чын.
Аддана зберагаць Айчыну
і жанчыну —
святая прастата
ўсіх грэшнікаў-мужчын.

На той зямной вярсце
пакутнай і апошняй,
якая кожны міг і крок наш сцеражэ,
няхай квітнее сад,
а не чарнее пожня,
і душы хай лятуць
бязгрэшныя вышэй!

***

Каб навучыцца жыць, любіць,
як продкі,
патрэбна ўсё наноснае забыць

і так, як продкі, думаць, гаварыць.
І ўсё наноснае сплыве з паводкай.

Нішто чужое памяць не кране
і сэрца наша гэтак на ўсхвалюе.
Наноснае жыцця нам не ўсталюе.
Каб жыць як след — чужому скажам "Не!"

Няхай язык адсохне ў круцяля,
які змала шальмуе продкаў мову.
Далоў хлусоў! І справы іх, і словы
забудзе заўтра ж родная зямля.
Узыдзе слава, Гонар усплыве,
калі сплывуць і бруд увесь, і пена...
І стане наша Беларусь нятленнай.
Пакуль жа дзякуй Богу, што жыве.

***

"На Беларусі — адны Марусі", —
аднойчы жартам казалі мне.
Каб не было ў мяне Беларусі,
дык і цябе б не было ў мяне.

Я ў гэта шчыра, наіўна веру,
з табою шчыра дзялю наіў.
Тваіх вачэй самавіты неруш
не раз мой стомлены Дух гаіў...

Хіба нам можна сядзець у скрусе,
калі ёсць мы, ёсць у нас Беларусь?
На Беларусі — адны Марусі...
А ты адзіная між Марусь.

Идите к храму

Недавно, возвращаясь по знакомой улице домой из университета, я увидела брезентовую палатку с крестом у входа. С досадой подумала, что сект в Минске стало слишком много, но все же решила полюбопытствовать. Повертевшись у палатки минут пять, я отважилась войти. Вид нескольких бабушек, поющих "Многие лета", несколько приободрил меня и развеял подозрения насчет секты. Взглядом отыскав в полумраке палатки человека в рясе, шагнула к нему. Представившись как начинающий журналист, я смогла побеседовать с отцом Владимиром.

Оказывается, на месте, где сейчас стоит палатка, планируется начать строительство нового храма Воскресения Христова по заказу Свято-Вознесенского приходского совета.

Главным архитектором проекта В.И.Романенко разработан эскиз однонефного, купольного, высотой около двенадцати метров здания, рассчитанного на триста прихожан. Сейчас строительство находится на стадии проектирования, но все грозит затянуться еще надолго. Сами понимаете, на пожертвования пятидесяти бабуль-прихожанок вряд ли можно даже оградить место будущего строительства. Приход, созданный два года назад, конечно, имеет своих попечителей, которые пока, к сожалению, могут помочь только рабочей силой и небольшим количеством стройматериалов.

Показали мне и гордость прихода — икону "Воскресение Христово", принесенную в дар будущему храму благословившим строительство Митрополитом Филаретом.

Сейчас на месте возведения будущей церкви каждый четверг и воскресенье читаются акафисты. Уже с двадцатого октября будет открыта школа милосердия для детей от шести лет.

Отец Владимир рассказал мне еще об одном проекте прихода — открытии кабельного общественного телевидения "Чистота", на котором будут транслироваться передачи религиозного содержания.

Для реализации всех планов Свято-Воскресенскому приходу нужны средства, единственным источником которых на данный момент являются добровольные пожертвования. Строящемуся храму необходима помощь. Только за оплату рабочего проектирования требуется внести сумму около тридцати миллионов рублей.

Вот номер телефона, по которому желающие помочь строительству церкви могли бы связаться с приходом: 261-52-59.

... Возвращалась домой — сквозь сутолку замусоренных автобусных остановок, по разбитым тротуарам и неуютным дворам, мимо неухоженных многоэтажек. Было грустно от того, что еще очень нескоро озарится наш город умиротворяющим светом золотых куполов, миром и согласием живущих. Бог в помощь людям, которые возрождают духовное богатство белорусского народа, пусть не будут им помехой ни финансовые трудности, ни политические передряги.

О.Давыденко, студентка факультета журналистики БГУ, для "БМ"

На страницах "Беларускай маладзежнай" —Биржа Труда.

Просьба к предпринимателям, руководителям предприятий, организаций, фирм с любой формой собственности: **предложите молодым вакантные рабочие места! Ваши объявления разместим бесплатно.**

Лучше иметь рядом надежного помощника и партнера, чем быть ограбленным отчаявшимся безработным!

Лучше богатеть вместе, чем ожидать очередного революционного раскулачивания!

Лучше заработать, чем украсть или выклянчить!

"Беларуская маладзежная" приглашает спонсоров, заинтересованных лиц для развития проекта "Биржа Труда".

Тел. 220-98-04

● Міжнародны форум "Улада і свабода слова"

Генадзь Бураўкін

Як стогн, як крык...

У адным з "чорных" адэскіх анекдотаў пабабелеўску нетрадыцыйны герой яго, цяжка ўздыхаючы, паведамляе:

— Вы будзеце смяяцца, але Абрамовіч — такі памёр.

Вы не будзеце смяяцца, можа, нават заплачаце, але ўсё бліжэй і бліжэй той дзень, калі цывілізаваны свет можа даведацца, што свабодная прэса ў Беларусі такі сканала, бязлітасна і подла задушаная ўладай. І гэта не анекдот, не фантазія, гэта горкая, трагічная рэальнасць.

Паміж уладаю і свабодай слова ніколі і нідзе не было асабліва любоўных adносінаў. І дзіўнага тут нічога няма, бо ўлада, дзяржаўная ўлада заўсёды нясе ў сабе элемент сілы, падаўлення. Разумная ўлада, цывілізаваная дзяржава падаўляюць ці спрабуюць падавіць горшае ў грамадстве, а ўлада дурная, дзяржава таталітарная падаўляюць, а то і знішчаюць усё найбольш сумленнае і таленавітае, што ёсць у грамадстве.

Нікому не хочацца нядобра гаварыць пра свой дом. Куды прыемней дзяліцца з суседзямі і гасцямі радасцю, рабіць ім падарункі, чым, захліпаючыся ад бясілля і роспачы, прасіць дапамогі і паратунку. Бачыць Бог — беларуская інтэлігенцыя вельмі любіць сваю зямлю, свой народ, сваю краіну. І тое, што яна знаходзіцца ў глыбокай і рашучай апазіцыі да сённяшняй улады, да амбіцыйнага і крыклівага нашага Прэзідэнта, не яе віна.

Па майму шчыраму перакананню, інтэлігенцыя — не толькі мозг нацыі, а і яе памяць, яе годнасць. І калі першая асоба краіны нахабна здзекваецца з роднай гісторыі, зневажае матчыну мову, робіць яе элементам насміхання з палітычных апанентаў, калі прыватызуе не толькі ўсе дзяржаўныя інстытуты, а і нашы пачуцці да іншых народаў, нашы стасункі са светам, як яна можа быць разам з гэтай асобай?

Я хацеў бы звярнуць увагу на тое, што на баку сённяшніх беларускіх улад няма ніводнага значнага таленту, ніводнага творцы, шырока вядомага на Радзіме і за межамі. Дробныя літаратурныя, музычныя, тэатральныя, кіношныя халуі, якія па радыё, тэлебачанні, у газетах ладзяць хваласпеў "усенароднавыбранаму", наўрад ці могуць успрымацца прафесійна ўсур'ёз. Аплёўванне з самых высокіх трыбун Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча стала своеасаблівым абавязковым рытуалам сённяшняга дня рэспублікі.

Самае ж жахлівае ў тым, што для тых, хто мае ўласную думку, уласную пазіцыю, уласны погляд на палітычныя падзеі, усё больш звужаецца магчымасць выказацца, падыскутаваць, разам з іншымі пашукаць ісціну. Тэлебачанне і радыё цалкам зачынены для апанентаў Прэзідэнта. Дайшло да таго, што ў эфір не пушчаюць кіраўніка парламенту. Ігнаруюць правы дэпутатаў, а прыблуднымі ідэалагічнымі палкоўнікамі складаюцца спісы "нашых" і "ненашых" пісьменнікаў, журналістаў, вучоных.

Для замежных палітыкаў юрыдычныя і сацыялагічныя прыслужнікі Лукашэнкі падсоўваюць лічбы колькасці афіцыйных і "неафіцыйных" газет, хітра ўтойваючы, што тыражы амаль усіх, разам узятых недзяржаўных выданняў "перакрываюцца" тыражом адной "галоўнай" газеты краіны... Вось так у нас ставяцца да канстытуцыйнага патрабавання аб інфармаванні грамадзян краіны, так "гарантуюць" права на свабоду слова.

Безумоўна, трэба з горыччу прызнаць, што ў сённяшняй жорсткай, самаўладнай атмасферы многія нашы журналісты не вытрымалі, зламаліся ці адступілі. На жаль, зусім не рэдкасць, калі нядаўні актыўны дэмакрат затыкае сабе рот сталінскай люлькай, з якой так самавіта плыве салодкі дымок алею ў гонар грознага кандыдата ў фюрэры; калі ўчарашні барацьбіт з мафіяй і бюракратыяй умела становіцца на заднія лапкі перад панскім сталом, на якім ляжыць не да канца абгладаная костка; калі разумны і цягавіты літаратар адкладае ўбок сваё вострае пяро і бяжыць на ціхую чыноўніцкую службу ці ў камерцыю... Ёсць усё гэта, ёсць. З песні слова не выкінеш. Вось і кладзецца на плечы тых, хто застаўся верны ідэалам дэмакратыі, свайму сумленню, яшчэ і дадатковы груз адказнасці, працы, пакут. Вось і здаюцца іх выступленні падобнымі часам на стогн ці крык.

Што ж трымае ўсё-такі на нялёгкіх, а то і небяспечных для далейшага лёсу пазіцыях лепшых людзей Беларусі, яе сыноў і дачок? Упартая надзея, што беларускі народ нарэшце прачнецца, выцярэбіцца з палітычнай апатыі, разбярэцца ў хлусні вусатых і бязвусых авантурыстаў. І яшчэ — разуменне, салідарнасць і падтрымка, даруйце за вельмі гучныя словы, прагрэсіўных сіл свету. Ужо доўгі час аператыўную, праўдзівую інфармацыю, нягледзячы на прамыя рэпрэсіі з боку нашых афіцыйных уладаў, нясуць не толькі блізкім і далёкім краінам, а і нам, беларусам, журналісты Расіі, Амерыкі, Францыі, Польшчы, Англіі. Я хацеў бы — па прыкладу маіх сяброў — выказаць ім і прафесійную, і грамадзянскую ўдзячнасць.

Магчыма, вы ведаеце, чулі, як наш "дэмакратычны" суд збіраўся караць "за выкрыкванне антыпрэзідэнцкіх лозунгаў" глуханямога хлопца. Было і такое. І ніхто за гэтае дзікунства не папрасіў ні ў хлопца, ні ў грамадства прабачэння, ніхто са служак Феміды не быў зняты са сваіх пасад. Ды і наіўна было б чакаць гэткага ад дзяржаўных мужоў, чыёй марай і задачай стала — зрабіць глуханямым увесь народ, каб ён маўчаў нават тады, калі яго будуць біць купленымі на ягоныя грошы дубінкамі натрэніраваныя ахоўнікі бязлітаснага рэжыму.

Мудрыя філосафы і вопытныя палітыкі, узабраўшыся на далёкія гістарычныя вышыні, часамі спакойна і паблажліва супакойваюць: ну чаго вы так хвалюецеся, чаго вы абураецеся, чаго вы лямантуеце — ўсё мінецца, і сённяшніх вашых фюрэраў і шэрых кардыналаў ніхто нават не ўспомніць. А я не хачу, каб іх не ўспомнілі. Я хачу, каб у памяці людской, у гісторыі засталіся і іхнія ганебныя справы, і іхнія персанальныя імёны. Таму што і дыктатарская палітыка Лукашэнкі, і езуіцкія закулісныя гульні з народам, і подлыя, атрутныя ўкусы іхняе паслухмянае хеўры пакалечылі, а то і загубілі не адзін чалавечы лёс, знявечылі, а то і растапталі не адну чыстую душу. І ў выніку не напісаліся новыя кнігі, не ўзляцелі новыя песні, не ляглі на палатно новыя, дасюль невядомыя фарбы. А, можа быць, гэта былі б творы, якія праславілі б Беларусь на ўсе часы?..

Зусім нядаўна, выступаючы перад студэнтамі, прэзідэнт Лукашэнка, тэмпераментна бэсцячы беларускіх пісьменнікаў, кінуў у маладую залу: "Не разумею, чаго ім не хапае і што ім трэба".

А не хапае нам на роднай зямлі адчування і дзяржаўнага падцверджання рэальнасці і непахіснасці суверэнітэту, не хапае свабоды, дэмакратыі, якіх мы трошкі глынулі і на якія маем Богам і гісторыяй дадзенае права.

І трэба нам нармальнае, людскае, цывілізаванае жыццё і адукаваная, інтэлігентная, спакойная ўлада, і свой пачэсны пасад між народамі.

І хочам мы, даўно і непахісна — людзьмі звацца...

А не хочам — душыцца нават слабым смуродам фашыстоўства, якога няўсцерп крывава наглыталіся беларусы не так ужо і шмат гадоў назад.

Вось у гэтым і спадзяемся мы атрымаць разуменне і падтрымку ва ўсім свеце.

Пампадурства — заўсёды самадурства

З вуснаў прэзідэнта Украіны нядаўна прагучала фраза: "Крый Божа змагацца з гэтым так, як гэта робіцца ў Беларусі". Л.Кучма меў на ўвазе публікацыю ва ўкраінскіх сродках масавай інфармацыі антыпрэзідэнцкіх і іншых не вельмі пажаданых ўладзе матэрыялаў. У такіх выпадках яго беларускі калега сыпле гром і маланкі. Леанід жа Данілавіч спакойна заўважыў: "Праз гэта трэба прайсці", а потым і згадаў нашу дзяржаву. Сумна, але факт: Беларусь ужо і там, і сям не сходзіць у людзей з языка, калі гаворыцца пра грубае парушэнне свабоды слова і друку. На жаль, А.Лукашэнка і высокія саноўнікі з яго атачэння не прыслухоўваюцца ні да парад кіраўнікоў суседніх краін і заходніх палітыкаў, ні да патрабаванняў тутэйшых апанентаў.

Вайна, развязаная на Беларусі супраць журналістаў, а значыць, і чытачоў са слухачамі, нагадала мне адну публікацыю пад красамоўным загалоўкам – "Печать современных помпадуров", на якую неяк натыкнуўся ў пажоўклым нумары "Правды", гартаючы старыя газеты са сваёй калекцыі. А хіба, падумалася, мала ў нас сёння пампадурства ў сферы інфармавання грамадства пра палітычна і сацыяльна-эканамічны стан краіны? Вунь Дзяржкамдрук на чале з У.Бельскім, з аднаго боку, выносіць неабгрунтаваныя папярэджанні незалежным выданням, у прыватнасці, газеце "Свабода". А з другога – не заўважае ў дзяржаўных і некаторых рускамоўных СМІ сапраўднае зневажэнне гонару і годнасці то дэпутатаў, то дзеячоў дэмакратычных партый і рухаў, то проста нацыянальна свядомых беларусаў.

Самадурствам – і не толькі ў эфіры – аддаюць і дзеянні кіраўніка Беларускага радыё У.Ядранцава. Калі вы, да прыкладу, плённа працавалі на забароненай па палітычных матывах радыёстанцыі "Беларуская маладзёжная", а зараз адстойваеце дэмакратыю і нацыянальную ідэю на іншых старонках, дык вас не дапусцяць на "даверанаю яму тэрыторыю". І для яго няважна, што маеце законнае права ўвайсці ў студыю, бо, па просьбе "Радыё Расіі", якое арэндуе тут тэхнічныя магутнасці, падрыхтавалі ўжо аб'яўленую перадачу. Галоўнае – пафанабэрыцца, паказаць сваё начальніцкае "Я".

Але Ядранцава пераплюнаў у пампадурстве ягоны шэф – старшыня тэлерадыёкампаніі Р.Кісель. Апошні можа паспрачацца на гэтай "ніве" з самім палкоўнікам У.Замяталіным, заслугі якога ў ажыццяўленні палітыкі інфармацыйнага тэрору, манапалізацыі дзяржаўных СМІ цяжка перабольшыць. Імкнучыся дагадзіць прэзідэнту, Кісель фактычна ператварыў наша Нацыянальнае тэлебачанне ў вотчыну аднаго чалавека і не жадае нават слухаць пра нейкія там патрабаванні нарматыўных актаў. І ў той жа час у нядаўнім інтэрв'ю газеце "Имя" такое пеканул! Аказваецца, БелТБ, а значыць, і яго інфармацыйныя, палітычныя і да т.п. праграмы маюць такія вартасці, як "размеренность, доброта, нравственность, неагрессивность...". Што тычыцца "диктатора Лукашенко", дык, паводле Кісяля, ён "покажется вам ангелом", калі "придет товарищ с партбилетом". У якім выглядзе паўстане тады перад намі сам вяшчун, застаецца толькі гадаць.

Можа, не кожны памятае, што ўпершыню словам "пампадуры" назваў царскіх адміністратараў-самадураў М.Салтыкоў-Шчадрын больш як 130 гадоў таму. Супраць савецкіх пампадураў заклікаў узнімаць "ярость масс" У.Маякоўскі. Крытычныя стрэлы ў галоўнай газеце былога Саюза, датаванай 6 траўнем 1934 года, скіраваны на замежныя сродкі масавай інфармацыі.

Вось некалькі цытат з той "Праўды": "Газеты просто перепечатывают то, что им дается", "У журналистов нет гражданского мужества", "Скучны и унылы серые простыни, заполняемые однообразной стряпней министерских канцелярий", "Печать труслива поджала хвост", "Они (газеты – Г.Л.) не смеют, конечно, и заикнуться о том, что происходит в стране", бо не правіцелі мараць аб тым, каб у ёй "царила тишина кладбища".

Здаецца, што гэта напісана пра тую сённяшнюю прэсу Беларусі, якая з'яўляецца рупарам палітыкі А.Лукашэнкі. А даўнія мроі наконт магільнікавай цішыні да болю нагадваюць памкненні цяперашніх высокапастаўленых асоб выканаўчай улады нашай краіны. Лагічна, што і "здабыткі" пампадураў ад друку як у 1934 годзе, так і ў 96-м аднолькавыя: гэта, у прыватнасці, значнае зніжэнне тыражоў ангажыраваных газет. Прыкметна зменшылася ў нас за апошнія гады і цікавасць да шмат якіх перадач электронных СМІ. Ці ж, тавар з душком ніколі не быў у цане.

...Мінула амаль два гады з таго часу, як у беларускіх газетах з'явіліся "белыя плямы". За імі, нібы шлейф, пацягнуліся шматлікія чорныя справы – рэпрэсіі супраць мас-медыя. Бо ў сваіх стасунках з імі прэзідэнт раўняецца не на суседзяў, не кажучы ўжо пра заходнія дэмакратыі, а на любы яму "нямецкі парадак" 30-х гадоў. Дарэчы, менавіта пра гэты парадак і быў адшуканы мною ў старой газеце артыкул "Печать современных помпадуров", як раз становішча друку Германіі пасля паўтарагадовага праўлення Гітлера аналізавалася ў ім...

Генадзь Лагуновіч, для "БМ"

Наша агитация

Справедливая народная мудрость: "Чем дальше в лес, тем больше дров" — в очередной раз доказывает свою правдивость. На шестом году так называемой демократии наши граждане научились голосовать не только "за" и "против", но также воздерживаться и не голосовать вовсе. Причем, все это имеет свое обоснование и свои формы агитации.

Выборы пока не дают ничего нового в отношении голосования "за". Те же встречи с избирателями, листовки, не использованные на прошлых выборах, и прочее старье. Только вот что-то БНФ очень сильно думает, участвовать ему в выборах, или нет. "Интриганы".

А вот голосование "против" или вообще не голосование на референдуме то и дело преподносят сюрпризы. Началось с того, что украинское подполье объявило информационную войну белорусскому истэблишменту. УНА-УНСО взялось за дело очень рьяно, выпустив в белорусский эфир полухулиганское "Радио УНСО". Через недельку-другую уже украинский истэблишмент помог "батьке", и радио это прикрыл. "Тамиздат" в электронном варианте, о котором писал наш С.Белко, не удался. Тогда украинские товарищи стали идти по старому пути — минская организация УНСО пишет листовки белорусскому народу. Хорошо, надо сказать, пишет!

Пишут и наши граждане. Нецензурные слова на листовках "Нам нужен референдум". Уж лучше бы они, граждане, вслух ругались. Такое не часто услышишь, а вот увидеть...

Но народ, как писали братья Стругацкие, сер, но мудр. И никакая власть своими объявлениями не переплюнет эту машину фантазии и оригинальности. Практически одновременно в Гомеле и Минске появились агитки, за которые любая учительница по агитации и пропаганде поставила бы ученикам "пять" за четверти и за год. Агитки действенны, эффективны и убедительны.

В Гомеле некий подпольщик ГАК (Гомельский Антифашистский Комитет) расклеивает на столбах обычные объявления, где большими буквами набираются одно-два слова: "ОЧЕНЬ ДЕШЕВО!". А за ними идет более мелкий текст типа: "продается свобода граждан Беларуси на референдуме. Необходимо срочно остановить зарвавшегося поклонника Гитлера. Скажи президенту "НЕТ!" Разумеется, за этим не следует никакого телефона для связи. Тут ясно, что и где продается дешево.

Об эффективности такой агитации я не говорю. Сам иногда ловил себя на мысли, что я автоматически тянусь к объявлениям во время долгого ожидания транспорта. Чем -то надо занять время, пусть даже чтением объявлений.

"Минский пример" более юмористичен и рассчитан не на всех, как в Гомеле, а на определенную категорию граждан. Обычно на дверях подъезда вешается объявление с зазывающей надписью снова -таки большими буквами: "Обращение к электорату Лукашенко!". А потом гораздо меньшими буквами: "Очень большая просьба не мочиться в лифтах!" И подпись: "Администрация ЖКУ."(ЖЭСа и т.п.) Разумеется, администрация к этому никакого отношения не имеет. Но уборщицы такие объявления срывать не торопятся. А вдруг это действительно администрация?

Особенно интересно, если это наклеено на внутренней двери лифта. Вроде бы, в лифте ничего нет, он чист. А вздумай проехаться этаж этак на девятый, из проема вместе с дверью вылезает агитация. А по прочтении (или приезду на нужный этаж) снова прячется. И снова лифт чист.

Никакое управление информацией при президенте сравниться по способам агитации с народом не сможет. У народа идей больше. А еще говорят, что люди у нас не талантливые. Хворый, видите ли, народ.

Да он поздоровее некоторых будет.

Сергей Пульша, "БМ"

«МЕНСК-96»: *спроба аналізу*

Фэстываль «Miensk-96» скончаны і закрыты тыдзень таму, ужо амаль спынены «разборы палётаў». Уласна, першая рэакцыя групы адміністратараў фэсту не была адназначнай — заўважаных там, за межамі сцэнічнай заслоны, памылак хапіла на ўсіх — а пры гэтым тэй аспэкт, што яшчэ ніводная імпрэза не давалася праз такія нэрвовыя перагрузкі.



Адзіным і галоўным адрозьненьнем «Менску» зьяўляецца поўная аддадзенасьць прынцыпу супольнай працы, калі існуе каманда аднадумцаў-сяброў, цяпер зьбіраемая штокастрычніка ў сталіцы. Каманда адмаўляе існаваньне любых пірамідальных формаў кіраваньня людзьмі — усе роўныя, але і ўсе нясуць адказнасьць за кожны ўласны крок, нельга падрываць давер сяброў, яшчэ горай — падарваць давер публікі.

Напэўна, пачаткам фармавання такіх адносін паміж апантанымі бардаўскай ідэяй людзьмі сталася вечарына першага красавіка 1993 года. Тады рэжысэр Мікола Казачонак кінуўся раптам у навучаньне невялікай групы студэнтаў асновам тэатральнасці; а праз два месяцы сталіца «развіталася» са Зьміцерам Бартосікам і Вальжынай Цярэшчанкай. Для кагосьці ўсяго толькі ня стала зорак на менскай сцэне, хтосьці мусіў супраціўляцца. Фэстываль «Менск-95» ня вырашыў нічога, але расставіў свае слупы ў бясконцым балоце беларускага мастацтва. Публіка з прыцэлам на сталічную элітарнасьць другі раз адкрыла Зьміцера і была ў шоку ад раптоўнага зьяўленьня Вальжыны. Так склалася, што апошні жывы на Беларусі бардаўскі фэстываль узяў на сябе абавязак вяртаньня з творчай эміграцыі, сёлета вярнуўся Алесь Камоцкі...

Да нашага вялікага жалю, беларуская публіка ўсё яшчэ не разумее прынцыповасьць сцэнічнасьці для бардаўскага жанру. Калі ў нефармальнай, аўтарскай, самадзейнай, любой іншай песьні можна яшчэ дазволіць разьняволенасьць выканаўцаў, тусоўкі за сцэнай, гучныя падзеньні перад мікрафонам,.. то ў тым і адметнасьць бардаў, што гэта аматарскі жанр, каторы заўсёды будзе ў вышэйшай ступені прафэсіяналізаваным. Мала каму зразумела, чаму за сцэну закрыты доступ усім (урэшце, канцэрт не пахаваньне, хаця выпрабаваньне куды большае), у дадатак да ўсяго, выхад на сцэну ў нецьвярозым стане (калі выпусьцяць!) падорыць пазбаўленьне ганарару і адхіленьне ад далейшага супрацоўніцтва.

Але тады, дванаццаць месяцаў назад, нам паціскалі рукі, а мы расцалоўвалі дзяўчат, каманда была сабраная, канцэрты мелі шалёны посьпех, бардаўскі рух, што ледзь не памёр, здолеў прайсьці рэанімацыю. Дайшлі да прызнаньня ня ўсе, губляць сяброў на творчых разьездах стала звычайным. А мы ўсё ня верылі ў пэрспэктывы «Miensku-96». Адразу вылучыліся прыхільнікі і супраціўнікі: для кагосьці барды ў думках былі проста адпетымі п’яніцамі, для кагосьці моцнагалосымі д’ямэнтамі на беларускай сцэне. Жанр бардаўскай песьні вызначаецца лягчэй за іншыя, складаецца з трох галоўных элемэнтаў: тэксту, музыкі і выкананьня (напрыклад, у поп-музыцы — рытм, у эстрадзе — аранжыроўка), для ўспрыманьня публікай неабходна мець любыя два кіты з трох, хаця сыстэма слухачы-сьпявак ўсё ж застанецца няўстойлівай. Бязумоўна, шмат хто з бардаў мае дадатковыя ўзмацняльнікі пазыцый, для Андрэя Мельнікава — шчырасьць і юначая адкрытасьць, для Віктара Шалкевіча — тэатралізаваная акторская гульня з жорсткай жыцьцёвай рэчаіснасьцю, у Алеся Камоцкага — ўжываньне элемэнтаў сымфанічнага выкананьня. Але ніякая лёгіка не пралічыць ні рэакцыю публікі, ні адданасьць аўтара свайму выкананьню ў канкрэтных абставінах, у залі і ў часе.

Калі-небудзь мы раскрыем відэаархівы здымак за сцэнай. Для кожнага чалавека, што стаіць на прафэсійным падмурку, сцэна была і будзе асабістай трагедыяй, пажыральнікам нэрвовых і псыхалягічных рэсурсаў, і адначасова вірам, каторы засмактаў аднойчы і ўжо не адпусьціць ад слухачоў, аднадумцаў, сяброў, што сарвуцца па першым званку, каб «прыляцець» на дапамогу. Каманда жыве па сваіх законах, дзе няма мэтраў і дылетантаў.

Тыдзень таму адміністратараў колькасьцю чатыры чалавекі было мала. Трагедыя сцэны паклала свой нязьдымаемы позірк. Пагэтуль чуваць водгалас пра закрытасьць тусоўкі, каторая перастала быць тусоўкаю год назад, што туды, за сцэну, нельга патрапіць нават сябрам. А хто тады дасьць асобе права выйсьці да сваёй публікі ў сваёй непадробнай абалонцы, перасіленасьць эфэкту знаёмства зьнішчае адчуваньне сцэны. Гэтая разьдзеленасьць — адзіны шлях фармаваньня прафэсійнасьці ў выкананьні.

Кастусь Елісееў, «БМ»,
дырэктар фэстывалю

P.S. «Разбор палётаў» працягваецца...



“Мы будзем спяваць самай мёртвай і чыстаю мовай”

Першае адзяленне першага дня было звычайным — на фоне другога. Не надта моцныя вершы, простая, тыпова “самадзейная” музыка і слабыя галасы. Вядомы С.Міцкевіч перамудрыў у новых песнях: працяг “Жашкаў” — “Жахі” былі на самой справе даволі жахлівымі — не па змесце, а па выкананню. Ён позна зразумеў, што не трэба “глытаць” мікрафон. Гук, дарэчы, уздыме захапіў залу патрыятычнасцю, беларускасцю! Ён усё сказаў: як і чаму варта жыць, чым ганарыцца, за што — любіць...

І доўга-доўга моўчкі стаяў, а з залі несліся роўным строем апладысменты, потым воклікі “Жыве Беларусь!”. А ён яшчэ праспяваў на развітанне народную, аршанскую — разам з залай!

Але былі і тыя, хто зыходзіў падчас другога адзялення.



Можа, таму, што палова на дзесятую, а, можа... тады мне не зразумела, чаму.

Адзін знаёмы хлопец, што вучыцца на спевака, растлумачыў свой зыход пасля першай часткі тым, што страшэнна стаміўся ад нізкай якасці і запалітызаванасці. Ён нават Байку і Адамовічу не дараваў, што праслізнула слова “мудзішчаў”. Ён мае сваю праўду, але жаночая лірыка “не пайшла” і таму, што публіка жадала чуць, тым больш што на беларускай мове, зусім іншага. Калі ўжо лірыка “не вельмі”, дык хай хоць у якім выглядзе — палітыка. І гэта не хвароба, і не адмаўленне мастацкіх якасцяў — ну, жыццё ў нас такое, і далёка не ўсе аддаляюць сябе ад палітыкі.

А колькі было такіх, хто прыйшоў, каб проста пачуць сваё роднае слова! І ім, канешне, да “мастацкіх разбораў” было ўжо ў апошнюю чаргу.

А галоўнае, што наогул гледачоў было шмат. Нечакана шмат. І справа далёка не ў тым, што “уваход вольны”.

Андрэй Мельнікаў прафесійна, таленавіта і на такім увогуле спачатку быў “не вельмі”, чыста з-за тэхнікі.

Але ўсё гэтае ні ў якім разе не тычыцца апошніх у першым адзяленні — Руслана Байка і Алега Адамовіча. Гэты дуэт падаўся варты ледзь не “MTVunpluged” — файна выкананая музыка, неблагія вершы. Амаль не было словаў, кранаючых палітыку, але гэта было і пра яе — на “падкорkавым” узроўні. Ад хлопцавых гітар можна было проста абалдзець. Зрэшты — хлопцы сур’ёзныя і ў гэтым жа сэнсе сучасныя. Вось табе і дэбютанты.

Ну а потым..! Потым быў Гомельскі Феерверк. Пра Зьміцера Бартосіка ўвогуле можна напісаць толькі тое, што, калі ён папраўляў гітару, адыходзячы ад мікрафона, дзяўчына ў залі ад апасення, што ён ужо “ўсё”, ледзь не выкрыкнула: “ТЫ ПОЙ, ПОЙ!” А можна дадаць: тэксты, манера выканання, “захоп у палон” слухача, гітара — на самым годным узроўні, проста выдатна!

Дзяніс Носаў, для “БМ”

● Открой!

"Высокое начало самопожертвования..." (Сервантес)

Постоянными спутниками жизни Мигеля Сервантеса были отвага и нужда, честность и опять все та же нужда.

Он мечтал писать стихи. И писал их. И это о нем однажды сказали: "Одержал в стихах меньше побед, чем на его голову сыплется бед".

Бед и впрямь хватало. Для одного человека, пожалуй, с избытком.

Юношей вынужден был Сервантес покинуть родную Испанию, поступив в ключники к служителю Ватикана, монсеньору Джулио Аквавива. В обязанности новоиспеченного ключника вменялось также обучение своего господина латинскому языку.

Но дело в том, что Аквавиве некогда заниматься латинским. А если он и занимается, то только урывками, невнимательно и рассеянно.

Как учителя, Мигеля такой поворот где-то огорчает, но зато радует другое. Его служба позволяет прокормить себя, а также дает возможность хоть как-то помогать бедствующим родителям. К тому же, можно сколько угодно пропадать в библиотеках.

Аквавива неожиданно умирает, и молодой испанец остается в чужой стране буквально без куска хлеба.

И тогда Сервантес решает стать солдатом-наемником, как и его младший брат Родриго. Скуден солдатский паек, но и из него можно выделить какую-то малость для поддержки родителей.

Часто вспоминал молодой воин свою Испанию, Испанию гордых гор и щедрого солнца, Испанию короля-самодура и мужественного, несломленного душой народа.

Мигель мечтал о родине. Она неумолимо звала его. Она приходила к нему в издерганных солдатских снах.

О храбрости воина Сервантеса ходили легенды. В битве под Лепанто он теряет руку, но и одноруким Мигель оставался грозой для врага. Не зря его прозвали дьяволом во плоти, а его меч — разящим.

Служба сделала его инвалидом, и та же служба никак не улучшила его личное благополучие.

Пешком, на лошади, осле, под палящими лучами остервенелого солнца, добирался недавний отважный вояка Сервантес в родные места.

Она уже была совсем рядом — родина.

Небольшой парусник. Море. У волны не особо-то крутой характер. Ветер радостно и свежо полнит паруса. Вот-вот в синей дымке так желанно возникнут испанские берега. Но неожиданно налетает свирепый шторм. Море словно взбесилось. Корабль швыряет, словно щепку. Когда стихия малость поутихла, судно захватили корсары.

Так вместо желанной Испании Сервантес попадает в Алжир, а вместо желанной свободы он становится рабом.

За попытку бежать здесь сажают на кол. Чтобы другим не было повадно. Сервантес делает несколько таких попыток. Все они заканчиваются неудачей. Но упорство и мужество "однорукого дьявола" вызывают невольное уважение даже у свирепых пиратов. Ему прощают судно и место корсарского предводителя на нем, но Сервантес отказывается и готовит новые побеги. Его ловят, возвращают и по-прежнему не решаются посадить на кол. Пять лет рабства казались вечностью. И все же наступил момент, когда нога Сервантеса наконец-то ступила на родную землю.

Как встретила Испания храброго воина?

Нищета родителей. Постоянные унижения в бесконечных хлопотах получить хоть какую-то пенсию.

Нужно на что-то жить...

Нужно как-то жить...

Сервантес пытается писать пьесы.

Их отвергают.

Он пишет ходульный роман.

Ему платят гроши.

Он добивается места королевского сборщика налогов.

Он слишком порядочен, чтобы быть им.

Дороги Испании... Раскаленные каменистые тропы... Понурый мул ее передвигает ноги... За спиной всадника в старом клетчатом платке притихло маленькое черноглазое существо — его дочь.

Судьба связала Сервантеса с женщиной, которая не понимала да и не хотела его понять. Встречаются такие женщины, которые высушивают сердце мужчины, словно солнце пустыню. Тем не менее, в семье Сервантеса рождается дочь. Мать уходит, оставляя незадачливому мужу девочку и невыплаченные долги.

С тех пор отец и дочь неразлучны в своих скитаниях. И странно: ни мерное покачивание мула, ни адская жара, ни продолжительность пути, ни внезапный порыв ветра или дождь не смущают малышку. Она не капризничает, мирно сосет хлебный мякиш, уставив глазенки в выгоревшее от солнца небо, тем самым как бы подбадривая бесконечно уставшего душой отца.

Сервантес вновь и вновь пытается писать, надеясь заработать хотя бы немного денег.

Безуспешно...

Наконец-то он женится на женщине необразованной, но с добрым и чутким сердцем. Появляется человек, который позаботится о его дочери.

Небольшой домишко. Тишина. Такая выстраданная и желанная. Тепло и уют не только в доме. Потрескивание горящих поленьев в камине. Писчих перьев можно одолжить у гусака, который важно расхаживает по двору. Бездна читаемых рыцарских романов. Женщина иногда оторвется от вязания:

— Вот если бы ты так смог написать... Хотя бы приблизительно так.

Да, он напишет. Только он станет писать иначе, не так, а немного наоборот.Он раскажет о странном костлявом старике, который, возомнив себя странствующим рыцарем, отправится на поиски справедливости. Ну не совсем старике, так, мужчине в годах. Его, правда, считают сумасшедшим, а он добрый. Над ним смеются, всячески потешаются, а у него честное и отважное сердце.

Дон-Кихот Ламанчский... Странствующий рыцарь... Идальго... Бедный, словно церковная крыса... Хотя нет, достаток небольшой имеется... Добро иногда терпит поражения, но рано или поздно все доброе побеждает...

Но сборщика королевских налогов Сервантеса неожиданно обвиняют в утайке части налогов. В результате двери тюремной камеры захлопываются за ним. Попытки доказать свою невиновность тщетны. Сервантесу остается единственное — продолжить скитания вместе со своим героем. Надзиратели лишь недоуменно пожимают плечами, иногда крутят указательным пальцем у виска:

— Странный донельзя заключенный. Ничего не требует, только чернила, бумагу, перья.

После окончания тюремного срока работа над романом продолжается. Наконец — вздох облегчения. Рукопись закончена. Догорает свеча. Сумерки подступают к столу все ближе. Сервантес дремлет в кресле. Медленно зарождается рассвет. Наступает новый день. Сервантес бережно заворачивает рукопись в кусок полотна. Он несет ее издателю и даже не подозревает о том, что передает увесистый сверток не подслеповатому издателю, а самому человечеству.

Мигель Сервантес умер в нищете. Он умер сказочно богатым нищим, ибо он создал книгу, сделавшую бессмертным его имя, потому что душа и сердце его Дон Кихано — душа и сердце его народа, потому что вся его жизнь, творчество, как писал Н.Г.Чернышевский, "врожденное верное чувство всего великого и благородного".

Трудно отыскать человека, который бы не читал эту удивительную, добрую, честную, великую книгу, автором которой является Мигель де Сервантес Сааведра.

О самом Сервантесе и его герое написано немало книг, статей, исследований. Все они — звезды различной величины и яркости, но собранные вместе, они образуют настоящий млечный путь. Одна из таких звезд — роман Бруно Франка "Сервантес". Это прекрасная книга уже тем, что передает дух своего героя. Она заканчивается словами, которые мне бы хотелось здесь привести:

"Близится конец Дон Кихота. Его окружают друзья. Санчо, всхлипывая, заговаривает с ним о новых походах, новых подвигах. Но повязка мечты спадает с глаз навсегда очарованного, и он говорит:

"Тише, господа мои, тише! Прошлогодние гнезда — не для нынешних птиц. Я больше не Дон Кихот из Манчи. Я снова Алонсо Кихано, которого некогда называли Алонсо Добрый".

Так, спустя долгие годы, однажды окончится его книга — этим простым, всерасквывающим и волшебным словом — добрый.

Небо над Трианой еще слегка светилось. И он увидел удаляющегося туда гигантского и костлявого всадника: через пространства и времена гнался за уходящим мерцанием рыцарь — копыта его клячи спотыкались на испанской земле, но благородная и смешная его голова почти касалась звезд".

С.Толкачев, г.Пинск, для "БМ"

"Беларуская маладзёжная"
Рэспубліканская грамадска-палітычная незалежная газета
Заснавальнікі:
М.Капчонаў і І.Цішын

Адрас рэдакцыі:
220134, Мінск,
вул. Якубоўскага, 15-1-77
Кантактныя тэлефоны: 57-00-43, 20-98-04
Пасведчанне аб рэгістрацыі N 665

Падпісана ў друк 17 кастрычніка 1996г. ў 14.30
Мінская паліграфічная фабрыка "Чырвоная зорка"
(Мінск, 1-шы Загарадны зав., 3)
Кошт праз "Белсаюздрук" 2000 рублёў
Тыраж 5 тысяч экз.
Заказ N 571

Галоўны рэдактар
Т.І.Мельнічук
(Нічыпарук)